# НЯМА БУДУЧЫНІ

## Што чакае жыхароў Латвіі?




**Па замове гандлёвай сеткі Rimi служба Norstat правяла сацыялагічнае апытанне сярод жыхароў Латвіі, паведаміў Baltnews. Высветлілася, што 48 працэнтаў апытаных эканомяць на прадуктах харчавання, адзенні і абутку. Траціць сродкі на сваю знешнасць гатовыя толькі 42 працэнты рэспандэнтаў. Цяпер жыхары Латвіі радзей купляюць ялавічыну і рыбу, аддаючы перавагу курыцы ці субпрадуктам. «Шчыра кажучы, я наогул мала ем, таму што цэны вельмі высокія», — прызналася адна з рэспандэнтаў. Адзначаецца, што 80 працэнтаў жыхароў Латвіі выбіраюць прадукты па нізкай цане. Як вядома, гэтая прыбалтыйская краіна ўпэўнена трымаецца ў лідарах Еўрасаюза па прадуктовай інфляцыі. Як падлічыў эканаміст Яніс Херманіс, калі агульная інфляцыя пачынаючы з 2020 года склала 32 працэнты, то прадуктовая — ажно 42 працэнты. Прычым толькі летась прадукты падаражэлі ў сярэднім на 24 працэнты. Напрыклад, кілаграм мукі ў Латвіі каштуе каля 1,95 еўра, у той час як у Літве яна абыходзіцца ў 1,59 еўра, у Швецыі — 1,53 еўра, у Францыі — 1,29 еўра, а ў Польшчы — 90 цэнтаў. Пры гэтым сітуацыя пагаршаецца ўжо каторы год, а ва ўлад зусім іншыя прыярытэты, ім не да надзённых патрэб насельніцтва. Людзі проста даведзены да адчаю. Што ж чакае жыхароў Латвіі?**

### БЕЗ «ПАДУШКІ БЯСПЕКІ»

Кандыдат у Еўрапарламент, дзейны дэпутат парламента Латвіі ад партыі «Саюз зялёных і сялян» Ліга Кляўіня заявіла, што пасля абрання ў Еўрапарламент плануе паляпшаць дабрабыт насельніцтва краіны. Па яе меркаванні, сёння ўзровень жыцця ў гэтай прыбалтыйскай дзяржаве складае ўсяго толькі 35 працэнтаў ад сярэднестатыстычнага паказчыка па Еўрасаюзе.

Як стала вядома, у Латвіі павялічваецца доля насельніцтва без зберажэнняў — гэты паказчык дасягнуў 26 працэнтаў, тады як восенню мінулага года такая сітуацыя датычылася 24 працэнтаў рэспандэнтаў, паведамілі агенцтву LETA прадстаўнікі SEB Banka, спасылаючыся на звесткі праведзенага даследавання. Таксама па яго выніках стала вядома, што амаль кожны чацвёрты рэспандэнт быў бы вымушаны выкарыстоўваць «падушку бяспекі» для пакрыцця штодзённых выдаткаў на працягу апошніх шасці месяцаў.

Пры гэтым і зарабіць тут не выпадае. У мінулым годзе ў Латвіі беспрацоўных было ў 2,5 раза больш, чым свабодных рабочых месцаў, піша Diena. Летась у краіне працавалі 884,2 тысячы чалавек, што складае 64,2 працэнта насельніцтва ва ўзросце 15—74 гадоў. У той жа час 61,5 тысячы чалавек у гэтай узроставай групе былі беспрацоўнымі. Летась узровень беспрацоўя ў Латвіі склаў 6,5 працэнта, пры гэтым самы высокі паказчык быў у Латгале, а ніжэйшы — у Рызе, паведаміла Diena. Эканамісты банкаў і эксперты Міністэрства фінансаў адзначаюць, што асноўнай тэндэнцыяй, якая ўжо ўплывае на рынак працы і ўсё мацней будзе ўплываць на яго ў будучыні, з'яўляецца скарачэнне колькасці працаздольнага насельніцтва — грамадства старэе, а моладзі мала.

«Сярэдні ўзрост у Латвіі павялічыўся, мы паступова становімся больш сталымі. Напрыклад, у 2000 годзе сярэдні ўзрост складаў 38,3 года, цяпер — 42,7 года», — адзначыў iz.ru прафесар Латвійскага ўніверсітэта Зайга Крыш'янэ. — У 2030 годзе амаль палова жыхароў будуць старэйшымі за 50 гадоў, а колькасць працоўных скароціцца на 20 працэнтаў».

### КРАІНА ВЫМІРАЕ

Натуральны прырост насельніцтва ў Латвіі адмоўны з 1990 года. Але настолькі дрэнна з дэмаграфічнай сітуацыяй, як апошнім часам, яшчэ ніколі не было. Пачынаючы з 2021-га колькасць памерлых удвая перавышае колькасць нованароджаных. І гэта адбываецца ўжо трэці год запар, паведаміла Цэнтральнае статыстычнае ўпраўленне прыбалтыйскай краіны.

Пастаўлены чарговы антырэкорд: летась у Латвіі нарадзілася 14 121 дзіця, і гэта мінімум за ўсю 123-гадовую гісторыю сучаснай статыстыкі. Менш за ўсё дзяцей нарадзілася ў чацвёртым квартале 2023 года — на 2,7 працэнта, ці на 92 дзіцяці менш, чым за аналагічны перыяд 2022-га. Акрамя таго, у кожным месяцы 2023 года нарадзілася менш дзяцей, чым у адпаведным месяцы папярэдняга года, што з'яўляецца найменшай колькасцю нараджэнняў у кожным месяцы за апошнія 100 гадоў.

У адкрытай базе Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення ёсць даныя аб колькасці народжаных пачынаючы з 1920-га (адзіны пропуск — за 1944-ы). З іх відаць, што ў гэтым дзесяцігоддзі антырэкорды па колькасці народжаных у Латвіі перапісваюцца цяпер штогод: папярэдні (15 954) быў зафіксаваны ў 2022-м, а да гэтага — у 2021-м (17 420) і 2020-м (17 552). За мінулы год колькасць жыхароў краіны зменшылася на 18,5 тысячы чалавек. Сёлета на пачатак года ў Латвіі налічвалася 1 мільён 873 тысячы жыхароў. Летась было зарэгістравана амаль на 10 працэнтаў шлюбаў менш, чым у 2022-м.

Дэмографы прагназуюць, што да канца стагоддзя ў Латвіі застанецца ўсяго каля паўмільёна жыхароў. «Краіна вымірае без войн і катастроф. Так хутка не раствäралася ніводная дзяржава свету. Цэлыя рэгіянальныя цэнтры ператвараюцца ў пустыя гарады-здані, — з горыччу заўважыў iz.ru журналіст Яніс Шкупеліс. — Фактычна ў Латвіі застануцца толькі старыя людзі, жыццё якіх будзе, на жаль, нікчэмным».

### ВЫЦВЯРЭЗНІК ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Як вядома, будучыню вызначае моладзь. Тут у Латвіі, мякка кажучы, вялікія праблемы. Краіна лідзіруе сярод краін Балтыі па колькасці падлеткавых цяжарнасцяў. Пра гэта заявілі медыкі ў эфіры праграмы «Падрабязнасці» на Латвійскім радыё 4, паведаміў партал навін латвійскага радыё і тэлебачання Rus.LSM.lv. Паводле статыстычных даных, у 2022 годзе больш за 90 непаўналетніх дзяўчат ва ўзросце 15—17 гадоў сталі мамамі. Па словах урачоў, калі ў прыкладна сотні непаўналетніх у Латвіі штогод нараджаюцца незапланаваныя дзеці, то каля 30 працэнтаў незапланаваных цяжарнасцяў у гэтай узроставай групе завяршаецца абортамі.

Акушэры лічаць, што за высокімі паказчыкамі абортаў і нараджэння дзяцей у непаўналетніх маці стаіць беднасць, неадукаванасць і недаступнасць сродкаў кантрацэпцыі. Яны заклікаюць дзяржаву забяспечыць дзяўчатам да 25 гадоў бясплатную кантрацэпцыю і адшукаць на гэтыя патрэбы сродкі з дзяржбюджэту — прыкладна 2,7 мільёна еўра. Кіраўнік Латвійскай асацыяцыі акушэрак Лінда Вейдэманэ лічыць, што для зніжэння ўзроўню абортаў і падлеткавых цяжарнасцяў у краіне трэба скарыстацца вопытам суседніх краін, у якіх ёсць даступная бясплатная кантрацэпцыя і ўпарадкаваны пытанні сексуальнай і рэпрадуктыўнай адукаванасці. «Калі абедзве гэтыя рэчы адбываюцца ў краіне ў нармальным парадку, то і падлеткавых цяжарнасцяў менш», — адзначыла кіраўнік акушэрак.

Таксама стала вядома, што ў найбуйнейшай бальніцы Латвіі плануюць стварыць выцвярэзнік для... дзяцей. За апошнія тры гады ў яе паступілі каля 850 непаўналетніх у стане ап'янення, 80 працэнтаў з іх ужывалі алкаголь, паведаміў партал навін латвійскага радыё і тэлебачання LSM.lv. Паводле звестак партала, у мінулым годзе ў бальніцу паступілі каля 200 непаўналетніх, якія ўжывалі наркатычныя рэчывы. Галоўны ўрач гэтай медыцынскай установы Рэната Сніпэ лічыць праблему надзвычай сур'ёзнай. Паводле яе слоў, п'яныя непаўналетнія пацыенты паводзяць сябе часам шумна і агрэсіўна, адбіраюць у персаналу час, энергію і псіхічныя рэсурсы. Урачы з-за гэтага менш часу могуць удзяліць хворым маленькім дзецям і іх маці.

### «ЧОРНЫЯ ДЗІРКІ» АДУКАЦЫІ

Высветлілася, што ў Латвіі каля шасці працэнтаў школьнікаў ва ўзросце ад 10 да 11 гадоў не ўмеюць... чытаць. Пра гэта паведамляе Baltnews са спасылкай на заяву кіраўніка Цэнтра дзіцячай літаратуры Латвійскай нацыянальнай бібліятэкі Сільвіі Трацьяковай. Паводле яе слоў, адсутнасць такога базавага навыку не дае магчымасці атрымаць якасную адукацыю ў будучыні. Пры гэтым, паводле вынікаў міжнароднага даследавання PIRLS, толькі 16 працэнтаў школьнікаў у Латвіі станоўча ставяцца да чытання. 37 працэнтаў апытаных заявілі аб адмоўным стаўленні да чытання, а 47 працэнтаў сказалі аб сваім нейтральным стаўленні. Як адзначае Baltnews, асноўная прычына падзення пісьменнасці ў краіне — востры недахват настаўнікаў. На 1 верасня мінулага года ў Латвіі не хапала каля дзвюх тысяч педагогаў. Але паляпшэнне сітуацыі не прагназуецца: у новым навучальным годзе латвійскі ўрад плануе скараціць 115 бюджэтных месцаў у сферы падрыхтоўкі настаўнікаў.

Вышэйшую адукацыю ў Латвіі цяпер атрымліваюць 74 тысячы студэнтаў — найменшы паказчык за апошнія 20 гадоў. Аб гэтым сведчаць даныя Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення краіны, паведаміла інфармацыйнае агенцтва «Сіньхуа». Зніжэнне колькасці студэнтаў напрамую звязана з дэмаграфічнай сітуацыяй і нізкімі паказчыкамі нараджальнасці. Прадстаўнікі ВНУ прызналі, што ўсё больш маладых людзей вывучаюць інжынерныя навукі, а навучальныя ўстановы гатовы дапамагчы работнікам асвоіць неабходныя для рынку веды і навыкі, паведаміла Латвійскае радыё.

### «МАЯ КРАІНА МЯНЕ ВЫКІНУЛА»

У такой сітуацыі зусім нядзіўна, што жыхары Латвіі імкнуцца трапіць у нашу краіну. На YouTube-канале БелТА латышка Вольга Самуль расказала аб прычыне пераезду ў Беларусь. «Шмат каментарыяў было мне пасля інтэрв'ю на іншых беларускіх каналах, што я праплачана, што кажу толькі пра добрае, што я завербавана. Ёсць жа шыльдачкі, на якіх напісана «Не прыязджайце, вас завярбуюць». Гэта не так, гэта поўнае глупства. Мне ніхто не плаціць. Я проста на сваім прыкладзе хачу паказаць, што ўсё не так, як расказваюць вашы збеглыя, наша тэлебачанне», — сказала Вольга Самуль.

Па словах латышкі, Еўрасаюз нясе парадак дня разрухі і краху. «Я перажываю за сваю краіну. На жаль, я не магу туды прыехаць і не магу змірыцца з кірункам, які выбраў урад Латвіі. Не народ, а ўрад Латвіі абраў за нас. Таму я выбрала Беларусь, каб тут жыць, ствараць сваю сям'ю. Душою жыць у першую чаргу і імкнуцца быць карыснай краіне, якая мяне прыняла, у якой я адчуваю сябе як дома», — дадала яна.

«На жаль, мая краіна мяне выкінула, нягледзячы на тое, што я там нарадзілася, што я патрыётка, змагалася за інтарэсы менавіта Латвіі, латвійскай дзяржавы і латвійскага народа. Я разумею, што я там не патрэбна. Я хачу быць карысная там, дзе адчуваю сябе добра, — заўважыла Вольга Самуль. — Спадзяюся, што буду карысная тут, таму буду далей асвятляць, адукоўваць, казаць праўду».

Разважаючы аб тым, з чым прыйшлося сутыкнуцца ў Беларусі, Вольга Самуль адзначыла: «Вельмі шмат маладых матуль. Я цяпер таксама ў становішчы, мне трошачкі не па сабе. Мне 38 гадоў. Тут у гэтым узросце нараджаюць ужо трэцяга, калі не чацвёртага. Усе маладыя бацькі. Мой узрост у Латвіі для першага дзіцяці ўжо з'яўляецца нормай. Там было страшна з-за няўпэўненасці. Тут, нягледзячы на тое, што я яшчэ на птушыных правах, толькі легалізоўваюся, я не адчуваю гэтага страху. Таму што бачу, што ваша краіна за дзяцей, за развіццё і садзейнічае дэмаграфіі, таму што ведае, што толькі ў дзецях дабрабыт дзяржавы. Бо калі не будзе нараджальнасці, не будзе народа, не будзе тых, хто будзе працаваць і будаваць дзяржаву. У нас у Латвіі гэтага не разумеюць. Таму і ставяцца да гэтага вельмі павярхоўна».

### УЛАДА СУПРАЦЬ НАРОДА

Затое мілітарызацыя прыбалтыйскай краіны адбываецца без праблем. Як стала вядома, еўрапейскія фінансавыя эксперты міжнароднай фінансава-кансалтынгавай кампаніі SIA Grant Thornton Baltic прапанавалі Латвіі ўвесці спецыяльны падатак на абарону, каб давесці фінансаванне выдаткаў на абарону да трох працэнтаў ВУП (цяпер 2,4 працэнта). Відавочна, што гэта першы інфармацыйны ўкід, за якім улады разгорнуць наступныя дзеянні.

Проста шакавальным стала паведамленне аб тым, што паліцыя Латвіі забараніла мясцовым жыхарам прыносіць кветкі ў знак салідарнасці з народам Расіі ў сувязі з жахлівым тэрактам у канцэртнай зале «Крокус Сіці Хол» у Краснагорску. Пра гэта паведаміла расійскае пасольства ў Рызе, перадае ТАСС. «У знак падтрымкі Расіі і сем'яў загінулых у выніку трагічных падзей у Падмаскоўі сотні жыхароў Латвіі, якія падзяляюць боль нашага народа, працягваюць прыносіць кветкі і лампадкі да сцен пасольства ў Рызе. Вось толькі мясцовым «ахоўнікам парадку», мяркуючы па ўсім, невядомыя такія паняцці, як спачуванне чужому гору, — латвійская паліцыя забараняе неабыякавым грамадзянам набліжацца да будынка дыпмісіі, каб ушанаваць памяць ахвяр жахлівага тэракта», — адзначылі ў дыппрадстаўніцтве.

Афіцыйная Рыга не грэбуе блакіроўкай сайтаў. Нацыянальным саветам па электронных СМІ Латвіі было прынята рашэнне аб закрыцці доступу да беларускіх медыярэсурсаў ont.by і sb.by. Як адзначылі ў Міністэрстве інфармацыі Беларусі, гэта «недапушчальныя дзеянні, накіраваныя на абмежаванне свабоды слова і мэтанакіраванае пазбаўленне латышскіх грамадзян права на атрыманне поўнай і аб'ектыўнай інфармацыі». «Атрымліваецца, яны сказалі наступнае: «Ідэалагічна няправільная інфармацыя, якая не адпавядае жаданням латвійскіх эліт, цэнтраў інфармацыйна-псіхалагічных аперацый НАТА. Гэтую інфармацыю мы вам чытаць забараняем, вы павінны быць абалванены натаўскай прапагандай». Латвія, па вялікім рахунку, не суверэнная дзяржава, — адзначыў у эфіры «Альфа Радыё» палітолаг Пётр Пятроўскі. — Ёсць сцяг, герб, гімн, але не Латвія вырашае, што ёй забараняць, яна поўнасцю падкантрольная адпаведным гаспадарам». У такой сітуацыі простым жыхарам Латвіі, на жаль, спадзявацца на лепшае не выпадае. Няма будучыні...

**Пётр ДУНЬКО.**


**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего**

**ОАО «Агрокомбинат «Скидельский»**

**Аукцион состоится 15.04.2024 г. в 14.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона | ЛОТ 1: капитальное строение, инвентарный № 412/С-87273 (целевое назначение – здание специализированное коммунального хозяйства 2 29 16, наименование – здание центральной котельной), общей площадью 134,0 кв. м), расположенное по адресу: Мостовский р-н, Дубненский с/с, аг. Хартица, ул. Ленина, 16Г.<br>Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 424081702101000578 площадью 0,0323 га (назначение – земельный участок для строительства и обслуживания здания центральной котельной), расположенном по адресу: Мостовский р-н, Дубненский с/с, аг. Хартица, ул. Ленина, 16Г.<br>Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранных зонах рек и водоемов), код – 2,4, площадь – 0,0323 га.<br>Условия аукциона:<br>- оплата за капитальное строение должна быть внесена в течение 90 (девяносто) календарных дней с даты заключения договора;<br>- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору;<br>- переход права собственности и передачи капитального строения осуществляется после государственной регистрации сделки;<br>- расходы по удостоверению договора купли-продажи капитального строения в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» несет покупатель;<br>- обязанности подписания и подачи в РУП «Гродненское агентство по государственной регистраций и земельному кадастру» заявление о государственной регистраций и документов, необходимых для осуществления государственной регистраций договора купли-продажи, и основанного на нем права собственности на капитальное строение возлагается на покупателя;<br>- по соглашению сторон отчуждаемое капитальное строение до полного расчета будет находится в залоге ОАО «Агрокомбинат «Скидельский.<br>Обременений со стороны третьих лиц не имеет |
| Начальная цена продажи | 4 800 руб. (четыре тысячи восемьсот рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 480 руб. (четыреста восемьдесят рублей) |
| Реквизиты для перечисления задатка | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| Место, дата и время окончания приема заявлений | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 11.04.2024 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 06.10.2023 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony | |



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества **ОАО «МТЗ»** (Продавец)

Аукцион состоится **29.04.2024 в 14.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1** в составе:

1. Здание карантинника на 300 голов, 407,5 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149390, инв. № 100403.
2. Механизированное зернохранилище емкостью 1000 т, 714,9 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149386, инв. № 100365.
3. Убойный пункт свинотоварной фермы на 1000 голов, инв. № 100341, 143,3 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149316, инв. № 100341.
4. Дезбарьер, площадь застройки 77,0 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149320, инв. № 104596.
5. Канализация бытовая, 285,0 м: № по ЕГРНИ 600/С-149330, инв. № 104590; инв. № 104589.
6. Здание свинарника-откормочника на 1000 голов, 1604,9 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149327, инв. № 100404.
7. Весовая, 87,0 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149391, инв. № 100342.
8. Хранилище для картофеля, овощей и фруктов, 663,8 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149387, инв. № 100364; инв. № 100561; инв. № 104594.
9. Водопровод пожарно-питьевой, 1573,8 м: № по ЕГРНИ 600/С-149389, инв. № 104591.
10. Здание свинарника для откорма на 1000 голов, 2591,1 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149331, инв. № 100339; инв. № 101594; инв. № 101743; инв. № 101740; инв. № 104593; инв. № 211241.
11. Трансформаторная подстанция свинотоварной фермы, 45,6 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149338, инв. № 100340; инв. № 185127; инв. № 185021; инв. № 185022;
12. Сборно-разборное здание арочник, 972,3 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149388, инв. № 100333.
13. Мастерская ремонтно-технической базы до 40 тракторов, 379,5 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149326, инв. № 100363.
14. **Движимое имущество:**
- камера холодильная, инв. № 175345;
- резервуар Р-5066, инв. № 114096;
- резервуар Р-5066, инв. № 114097;
- трансформатор ТМ-250/10-83У1-10/0,4, инв. № 113324;
- трансформатор ТМ-2501-10-83У1-10/0,4, инв. № 113325;
- весы автомобильные 500-2РС-30Ц, инв. № 119734;
- шкаф управления ШАУ-АВ, инв. № 126556;
- шкаф управления ШАУ-АВ, инв. № 126557;
- шкаф управления ШАУ-АВ, инв. № 126558;
- шкаф управления ШАУ-АВ, инв. № 126559;
- шкаф управления ШАУ-АВ, инв. № 126560.

**Адрес Лота:** Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Луговослободской с/с, 15/17; 15/21; 15/24; 15/23; около д. Обчак; 15/18; 15/25; 15/20; 15/19; 15/26; 15/22; 15/27, район д. Обчак.

Земельный участок 623684100001000288, 7,3507 га.
Право постоянного пользования.
**Начальная цена** с НДС 20 % – 3 962 521,33 руб.
**Задаток** – 500 000,00 руб. **Шаг аукциона** – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG». Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатка – 25.04.2024 в 11.00.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182



**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего**

**Слонимскому городскому унитарному предприятию жилищно-коммунального хозяйства**

**Аукцион состоится 30.04.2024 г. в 14.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лоты | |
|---|---|
| Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона | **Лот № 1:** трактор (бульдозер) Б10М.1111-1Е, 2004 г. в., заводской номер 34322(152520), инвентарный номер 907507 |
| | **Лот № 2**: автомобиль GAZ-53 19K0 50351, 1990 г. в., гос. № АЕ 6725-4, заводской номер XTH531900L1274632 |
| Начальная цена продажи | **ЛОТ № 1** – 35 160 руб. (тридцать пять тысяч сто шестьдесят рублей) с учетом НДС |
| | **ЛОТ № 2** – 9 720 руб. (девять тысяч семьсот двадцать рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка | **ЛОТ № 1 –** 3 516 руб. (три тысячи пятьсот шестнадцать рублей) |
| | **ЛОТ № 2** – 972 руб. (девятьсот семьдесят два рубля) |
| Реквизиты для перечисления задатка | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| Место, дата и время окончания приема заявлений | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – 26.04.2024 г. до 15.00 |
| Условия проведения аукциона:<br>- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта;<br>- возмещение покупателем затрат предприятия на оценку движимого имущества в сумме 208,15 рубля по лоту, выставляемому на торги;<br>- срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола аукциона.<br>Обременений со стороны 3 лиц нет | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony | |



Центр Промышленной Оценки
**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
**• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by |
| **Продавец** | ОАО «Сбер Банк», 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 32А-1 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б, www.ipmtorgi.by |
| **Предмет электронных торгов: имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Пушкина, 172** | **Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.** |
| **1. Здание банка** (здание нежилое) общей площадью 2124,2 кв. м, инвентарный номер 710/С-52251.<br>Составные части и принадлежности: подвал.<br>**2. Помещение гаражей** (помещение гаражей), общей площадью 41,6 кв. м, инвентарный номер 710/D-54201.<br>**3. Складское помещение** (складское помещение), общей площадью 41,3 кв. м, инвентарный номер 710/D-54202 | **2 425 080,00** |
| **Дополнительная информация по лоту:** при приобретении предмета аукциона победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона на сумму **89 437,70 бел. руб. с НДС 20 %.**<br>Состав имущества и цены размещены на сайте организатора аукциона www.cpo.by и www.ipmtorgi.by | |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 741000000006001659:** предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания Первомайского отделения ОАО «Белпромстройбанк» в г. Бобруйске общей площадью 0,2969 га | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»** | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после электронных торгов. **Условия оплаты предмета электронных торгов:** не более 30 дней со дня заключения договора купли-продажи | |
| **Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.** Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,5 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | Начало торгов: 10.00 **30.04.2024 г.**<br>Окончание торгов: 12.00 **30.04.2024 г.**<br>Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 29.04.2024 г. до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-310-36-37; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |



ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (продавец) **отменяет аукционные торги**, назначенные на 09.04.2024 г., информация о торгах была опубликована в газете «Звязда» от 27.03.2024 г. № 61 (30195).

УНП 400071204



В газете «Звязда» № 52 (30186) от 14.03.2024 (стр. 15) ООО «Фрондера» было опубликовано извещение о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛГРАН», назначенного на 17 апреля 2024 года в 12.00.
Торги по лоту № 12 (Компрессорная установка СБ4-С-100.АВ510, инв. № 498) **отменены** по решению продавца.

УНП 100062465



*Закрытое акционерное общество* ***«На Уманской»,***
расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 55,

**СООБЩАЕТ О ВЫПЛАТЕ ДИВИДЕНДОВ ПО АКЦИЯМ:**

| | |
|---|---|
| Дата принятия решения общего собрания акционеров, в соответствии с которым осуществляется выплата дивидендов по акциям | 29.03.2024 г. |
| Дивиденды, начисленные на одну акцию по результатам работы за 2023 г. | 6 руб. 29 коп. на 1 простую акцию |
| Срок и порядок выплаты дивидендов по акциям по результатам работы за 2023 г. | Не позднее 30.04.2024 г. Перечислены одновременно всем акционерам – владельцам простых акций, пропорционально количеству принадлежащих им акций |

УНП 101085067

***Общее собрание акционеров***



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Виктория-Агро» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества в составе:**

**Лот № 1: бригадный дом, инв. № 644/С-61026 общей площадью 97,4 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625083000001000010 площадью 0,0417 га** *(право постоянного пользования)*, **по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Октябрьский с/с, 8, р-н д. Салогощ.**
*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей, пл. 0,0044 га.*
Начальная цена с НДС (20 %) **– 7 500,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **750,00** бел. руб.

**Лот № 2: склад для хранения грубых кормов, инв. № 644/С-61030 общей площадью 1585 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625083000001000015 площадью 0,4510 га** *(право постоянного пользования)*, **по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Октябрьский с/с, 12, р-н д. Салогощ.**
*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей, пл. 0,0478 га.*
Начальная цена с НДС (20 %) **– 45 960,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **4 596,00** бел. руб.

**Лот № 3: весовая** *(составные части и принадлежности: навес)*, **инв. № 644/С-61032 общей площадью 6,9 кв. м, расположенная на земельном участке с кадастровым номером 625083000001000016 площадью 0,0379 га** *(право постоянного пользования)*, **по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Октябрьский с/с, 14, р-н д. Салогощ.**
Начальная цена с НДС (20 %) **– 9 180,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **918,00** бел. руб.
*Цена снижена на 50 %.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в следующем размере: по лотам №№ 1, 3 – 10 (десяти) процентов, по лоту № 2 – 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 08.06.2022, 02.09.2022, 13.06.2023, 01.11.2023.

Аукцион состоится **15.04.2024** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.04.2024** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11. Тел. для осмотра: 8 (029) 766-51-01.**

УНП 600072178